# ЗАСТАНЕЦЦА ТОЛЬКІ АДЗІН

## «Беларусь 5» выбірае «народных каментатараў»

**...Адбылося, спадарства. Нарэшце ў «канапавых крытыкаў», якім не падабаюцца стыль і манера выкладання тэлевізійнікамі спартыўных падзей, з'явілася магчымасць устаць з канапы і самім паказаць, як трэба. Спартыўны тэлеканал «Беларусь 5» днямі правёў набор удзельнікаў у новае рэаліці-шоу «Накаўт-раўнд», пераможца якога папоўніць шэрагі каментатараў і на ўласнай скуры дазнаецца, ці лёгкі гэта хлеб.**

Ахвотных, заўважым, набралася нямала — дырэкцыя тэлеканала атрымала звыш 100 заявак з розных гарадоў. Прагледзеўшы анкеты і праслухаўшы аўдыяфайлы з самапрэзентацыямі кандыдатаў, на другі этап адбору — сустрэчу пад прыцэлам тэлекамер — арганізатары праекта запрасілі крыху больш за 60 чалавек. За тым, як праходзіў кастынг каментатараў, паназірала і «Звязда».

«Размова будзе доўжыцца ўсяго некалькі хвілін, таму пастарайцеся максімальна ярка праявіць сябе. Бывае, што дастаткова і хвіліны, каб разгледзець патэнцыял каментатара, а бывае, патрабуецца даволі шмат часу, таму калі адзн з вас праявіць у студыі дзве хвіліны, а другі — дзесяць, гэта нічога не значыць, — папярэджвае патэнцыйных зорак тэлеэфіру дырэктар «Беларусь 5» Аляксандр Казюкевіч. — Сёння вы можаце заўважыць адабрэнне або сумненне ў нашых галасах, але не пачуеце ні «так», ні «не».

Пасля кароткага інструктажу ў студыю ўваходзіць першы прэтэндэнт. Гісторыя ў Дзяніса Акуловіча досыць тыповая: з дзяцінства захапляўся спортам, глядзеў футбол і запамінаў склад каманд СССР, пазней сам заняўся футболам, хакеем і нават шахматамі, а цяпер рашыўся адолець чарговую прыступку — расказваць пра футбол і хакей іншым балельшчыкам. Пра глыбокае веданне тэмы ў прыватнасці і вялізную любоў наогул да спорту, беларускага і сусветнага, сцвярджаў практычна кожны ўдзельнік кастынгу — што не замінала некаторым з іх часам блытаць каментатараў Сяргея Новікава і Уладзіміра Навіцкага, «сыпацца» на дадатковых пытаннях, скажам, пра сучасны біятлон ці бокс або губляцца пры просьбе перакласці тыповую фразу з футбольнага рэпартажу на англійскую мову. «Гэта ўсё хваляванне», — апраўдваліся кандыдаты.






Але нязвыклая абстаноўка і пільнае вока тэлекамеры бянтэжылі далёка не ўсіх. Як рыбы ў вадзе адчувалі сябе ўжо вопытныя спартыўныя журналісты — карэспандэнт Агенцтва тэленавінаў Павел Капуцкі, карэспандэнты з іншых тэлеканалаў. А прафесійны настольны тэнісіст Сяргей Комса, які ўжо 4 гады трэніруе дзяцей у Салігорску, аказаўся яшчэ і вопытным рыбаловам, членам нацыянальнай зборнай па паплавочнай лоўлі. Ён з такім імпэтам расказваў пра гэта сваё захапленне, што, здавалася, заслухаліся нават аператары.

— Добра, калі вы такі заўзяты рыбалоў, назавіце, калі ласка, самы вядомы ў сусветнай літаратуры твор пра рыбака, — папрасілі члены журы.

— Гэта вельмі лёгкае пытанне, — заўсміхаўся малады чалавек, — Эрнест Хемінгуэй, «Стары і мора».

Мінчанцы Наталлі Астапчук таксама ўдалося прыцягнуць да сябе ўвагу — мініяцюрная дзяўчына аказалася адзінай сярод удзельнікаў-хлопцаў. «Муж спачатку пасмяяўся з майго жадання адправіць заяўку на кастынг спартыўных каментатараў, — прызналася Наталля, — але я настроена пабіцца за перамогу. Жанчынкаментатараў у эфіры не так шмат, гэта хутчэй выключэнне з правілаў. Але, на мой погляд, каментаваць футбол або цяжкую атлетыку — гэта крута, гэта верх прафесіяналізму».

— Мы звяртаем увагу на самыя розныя аспекты, улічваем і адукацыю, і ўзрост кандыдатаў, — расказаў «Звяздзе» **дырэктар «Беларусь 5» Аляксандр КАЗЮКЕВІЧ**. — Хоць запрасілі і некалькіх удзельнікаў, якія не зусім адпавядалі ўмовам адбору, але было вельмі цікава з імі пазнаёміцца і паказаць гледачам спектр ахвотных стаць каментатарамі. Пакуль магу зазначыць, што агульны ўзровень менавіта гэтага праекта самы высокі з усіх кастынгаў, што мы праводзілі. Бачна, што людзі рэальна ацанілі свае магчымасці і ступень падрыхтоўкі.

Адбор — справа не аднаго дня, журы прагледзела некалькі груп, з якіх 16 чалавек трапяць непасрэдна ў рэаліці-шоу. Іх імёны будуць названыя ў тэлеэфіры «Беларусь 5» 31 снежня. А далей для адабраных шчаслівчыкаў пачнецца штотыднёвае спаборніцтва — уласна «Накаўт-раўнд». Удзельнікаў праекта аб'ядноўваюць у квартэты па відах спорту і будуць адсейваць: у паўфінал трапяць 8 кандыдатаў, у фінал — 4, а на ўмоўны каментатарскі п'едэстал-крэсла — як і належыць, толькі адзін. (Хоць тыя, хто сябе добра зарэкамендуе, з поля зроку тэлевізійнікаў дакладна не выпадуць і, магчыма, у будучым таксама рэалізуюцца ў эфіры.) Выбіраць найлепшага будуць сумесна прадстаўнікі медыяхолдынгу Белтэлерадыёкампаніі, вядучыя спартыўныя журналісты і дзейныя каментатары, а таксама, зразумела, тыя, для каго ўся справа распачыналася — тэлегледачы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.51 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.33 | 7.08 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.41 | 7.23 |
| Гомель — | 9.06 | 16.46 | 7.40 |
| Гродна — | 9.41 | 17.08 | 7.27 |
| Брэст — | 9.33 | 17.17 | 7.44 |

## Месяц

*Апошняя квадра 21.12—28.12. Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

## Імяніны

***Пр.** Данілы, Івана, Лукі.*
***К.** Евы, Ірмы, Эвеліны, Адама, Рыгора.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Пры прыёме на працу ў жанчыны пытаюцца:**
**— Колькі вам гадоў?**
**Тая, какетліва:**
**— Мне бліжэй да трыццаці, чым да дваццаці.**
**— А больш дакладна?**
**— Пяцьдзясят.**

— Што будзеце піць?
— Гарэлку.
— Колькі?
— Каб заўтра сорамна было.

**Муж вяртаецца з працы раней часу і застае жонку з незнаёмым мужчынам.**
**— Пазнаёмцеся, — кажа жонка. — Гэта мой муж, а гэта Віця. Ну, пакуль вы знаёміцеся, пайду выклікаць хуткую дапамогу.**

Сабраліся разам пяць сябровак, а гаварыць няма пра што.
Таму што сабраліся ўсе.

**Ем «Ролтан» і разумею, як моцна я кахаю цябе.**
**Калі ласка, Люся, вяртайся!**

Муж — жонцы:
— Дарагая, сёння да мяне прыедуць мае калегі, ты прыгатуй што-небудзь.
— Добра, дарагі. А як прыгатаваць: каб яны яшчэ зайшлі, ці каб больш не прыходзілі?

## Даты | Падзеі | Людзі

### 24 СНЕЖНЯ

**1801** год — 215 гадоў таму ў прамысловым мястэчку Камборн на паўднёвым захадзе Англіі механік-канструктар Рычард Трэвітык прадэманстраваў першы паравы аўтамабіль. Ён быў різлічаны на восем пасажыраў і прыводзіўся ў рух паравой машынай з адным гарызантальным цыліндрам і катлом высокага ціску на раме паміж двух велізарных задніх колаў. Вугаль у кацёл падкідваў качагар, які стаяў на запятках. Неўзабаве паравікі сталі самым хуткім транспартам для пасажыраў — хуткасць омнібусаў дасягала 24 км/г.



**1893** год — нарадзіўся Яўген Карлавіч Цікоцкі, кампазітар, народны артыст Беларусі і СССР. Адзін з заснавальнікаў беларускай прафесійнай музыкі. Сярод твораў: оперы «Міхась Падгорны», «Алеся», музычная камедыя «Кухня святасці», араторыя «Вызваленне», хоры, рамансы, песні, апрацоўкі народных песень, музыка да спектакляў і кінафільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1970 годзе.

**1901** год — 115 гадоў таму нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч Фадзееў, савецкі пісьменнік і грамадскі дзеяч. У 1946—1954 гадах — старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў СССР. Аўтар аповесці «Разлію», раманаў «Маладая гвардыя», «Разгром» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946). Цікавіўся развіццём беларускай літаратуры. Сябраваў і перапісваўся з Янкам Купалам, Якубам Коласам. Удзельнічаў у літаратурным вечары, прысвечаным 25-годдзю БССР (1944). Адкрываў дэкады беларускай савецкай літаратуры ў Маскве (1949). Інсцэніроўка рамана «Маладая гвардыя» ў 1947 годзе пастаўлена Беларускім тэатрам імя Янкі Купалы

**1936** год — нарадзіўся (в. Яжона, цяпер у Баранавіцкім раёне) Расціслаў Афанасьевіч Жмойдзяк, беларускі географ, картограф, прафесар, заслужаны работнік народнай адукацыі Беларусі. Аўтар навуковых прац па тапаграфіі і картаграфіі, картаграфаванні сельскагаспадарчай вытворчасці і насельніцтва, дынаміцы сельскага рассялення і інш. Навуковы кіраўнік раздзела «Нацыянальнага атласа Беларусі» (2002).

### Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**

*Не змізарнець бы на вяку,*
*Не збалоцілася б глеба тая,*
*Дзе і крынічка б'е, пакуль*
*Рака плыве і не сплывае.*

Дарагую **Надзею Уладзіміраўну ШЭЙБАК** з вёскі Скрышава Навагрудскага раёна шчыра віншуем з 70-годдзем! Жадаем

*На многія леты — здароўя, дабра!*
*Хай кожны дзянёк будзе ў свята!*
*Хай дом за вярсту абыходзіць бяда,*
*А радасці будзе багата!*

**З любоўю Вера, Іра, Люда і Андрэй.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 5010.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 снежня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12